**І. Каляда**

# ТВОРЧЫ ПОЧЫРК ВАСІЛЯ БЫКАВА

Імя Васіля Быкава выклікае ў думках успаміны пра жахлівыя часіны вайны, згадваюцца таксама вобразы герояў і здраднікаў. Чаму так? Таму што гэты пісьменнік належыць да тых творцаў, каго можна назваць эталонам праўды, хто змог пранікнуць у чалавечую псіхалогію і так своечасова і дакладна апісаць паводзіны людзей у экстрэмальных умовах. Яшчэ ў маленстве ён праявіў здольнасці да малявання, рабіў замалёўкі і падчас вайны, і пасля яе. Пільная ўвага да дэталяў, якая развіваецца ў працэсе выяўленчай творчасці, паўплывала на станаўленне своеасаблівага прадметна-рэчыўнага светабачання, якое яскрава прадстаўлена ў прозе В. Быкава.

Ужо ў першых апавяданнях В. Быкава (“Абознік”, “У першым баі” і інш.) выявіўся яго ўласны падыход да адлюстравання ваенных падзей, а таксама складваўся творчы стыль празаіка: эканомны, стрыманы, лаканічны. Герой В. Быкава бачыць вайну праз боль, праз учынкі і думкі, якія ўзнікаюць у пэўны момант – момант вайны. У сваіх творах аўтар паказвае несправядлівасць лёсу і страх чалавека перад невядомасцю. Шматлікія апавяданні празаіка прадстаўляюць франтавыя будні, так званыя тыповыя абставіны, без якіх нельга па-сапраўднаму ацаніць гераізм на вайне Прыгадаем, напрыклад, апавяданні “Страта”, “Эстафета”, “Чацвёртая няўдача” і інш. Васіль Быкаў напаўняе творы драматызмам. Менавіта падчас перажывання вострых падзей творца дае магчымасць героям зрабіць свой выбар і напоўніцу праявіць свае маральныя якасці, у тым ліку пачуццё ўласнай годнасці. Прычыны тых ці іншых паводзін герояў празаік шукае ў іх мінулым жыцці, таму робіць адступленні ў перадгісторыю кожнага (аповесць “Жураўліны крык” і інш.). Вялікае месца ў творчасці В. Быкава займае катэгорыя будучыні ў кантэксце ваеннага мінулага. Аповесць “Мёртвым не баліць” дэманструе гэта. Паказ мінулага перакрыжоўваецца з адлюстраваннем пасляваеннага часу. Прадстаўляецца комплекс чалавечых і грамадскіх адносін, якія моцна ўплываюць на жыццё наступных пакаленняў.

Як мастака, філосафа і асобу Васіля Быкава асабліва цікавіла праблема выбару, супярэчлівасць характараў людзей, шматаблічнасць жыцця. Важным для аўтара было паказаць супрацьстаянне дабра і зла ў мірны час, калі ўжо не было вайны, але яна працягвалася ў душах герояў яго твораў.

Такім чынам, акцэнт у творах пісьменніка робіцца на ідэі самакаштоўнасці і ўнікальнасці чалавечага жыцця, усё, што адбываецца з героямі, аўтар вымярае высокімі крытэрыямі праўды і гуманнасці. У паказе лёсаў людзей на вайне В. Быкаў прытрымліваецца акрэсленага ім прынцыпу “каб паказаць вайну ў сапраўдным абліччы, патрэбна праўда і нічога, акрамя праўды”.